ГОД ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

# Праца сувязіста на вайне – адказная

**Жыццёвы шлях героя гэтага матэрыялу ўсё жыццё быў напоўнены сумнымі і радаснымі падзеямі. Нарадзіўся Фёдар Трафімавіч Курзянкоў у 1926 годзе ў вялікай сялянскай сям'і. Яго дзядуля і бацькі працавалі ў мясцовым калгасе. Хлопчык рос паслухмяным, працалюбівым.**



Фёдар Курзянкоў

Ішоў 1937 год. З гісторыі ведаем, што 30-я гады – гэта годы рэпрэсій. Не абмінула бяда і іх сям'ю. Нехта напісаў ложны данос і ў выніку – высылка ў далёкую Сібір разам з такімі ж «ворагамі народа» як і самі.

І толькі ў пачатку 1941 года адбылася рэабілітацыя. Курзянковы вярнуліся на малую радзіму. Пасяліліся на Сяле (цяпер гэта вуліца Набярэжная). Стала пакрыху наладжвацца жыццё.

Але нядоўга пражылі пад мірным небам: 22 чэрвеня пачалася Вялікая Айчынная вайна з фашысцкай Германіяй. З заміраннем сэрца слухалі тады жыхары Хоцімска выступленне па радыё Молатава.

Райкомам партыі быў дадзены загад: убраць вырашчаны ўраджай і схаваць, каб нічога не дасталося ворагу. Пачалася эвакуацыя насельніцтва пасёлка. На транспарце, конях, пешшу некаторыя хацімчане ўходзілі падалей ад фронта бясконцым патокам.Тэрмінова вывозіліся архівы вытворчасці, узрываліся адміністрацыйныя будынкі, уганялася ў тыл буйная рагатая жывёла.

Фронт імкліва набліжаўся. А ў хуткім часе Хоцімск акупіравалі нямецкія захопнікі. Першае, што яны зрабілі, сталі наводзіць свае «новыя парадкі». Акупацыя – жудасны час безупыннага не праходзячага страху. І колькі яна працягнецца – ніхто не ведаў.

Немцы сталі поўнаўладнымі гаспадарамі. Адразу далі зразумець, што мясцовае насельніцтва ніхто, рабы. Занялі лепшыя дамы. Вывесілі яны і загад аб камендантцкім часе. Насельніцтву дазвалялася выходзіць з дома з 8 да 18 гадзін. Была арганізавана і паліцыя з мясцовых атмарозкаў. Акупацыя паказала праўдзівы твар многіх жыхароў пасёлка. Два доўгія гады цягнуліся, як казалася, вечнасць.

У верасні 1943 года прыйшло доўгачаканае вызваленне. Радасць перапаўняла сэрца юнака. І адразу хлопцы, якім споўнілася па 18 гадоў, пайшлі ў ваенкамат. Фёдару ж было толькі 17. І ён пайшоў на хітрасць «накінуўшы» год. Быў залічаны ў стралковы полк 50-й Арміі, якая вызваляла раён. А потым была кароткая вучоба, і Фёдар ужо сувязіст.

Немагчыма перабольшваць роль сувязі і сувязістаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Бесперабойная сувязь сур'ёзна ўплывала на зыход усёй баявой аперацыі: адсутнасць яе прыводзіла да страты ўпраўлення войскамі, таму хутчэйшае аднаўленне з'яўлялася адной з важнейшых задач. Праца сувязіста на вайне – самая неабходная, самая ганаровая і адказная. Днём і ўначы, у сцюжу і ў спякоту, у абароне і ў наступленні сувязісты працавалі для забеспячэння бесперабойнай сувязі. Пад градам куль і снарадаў яны павінны былі знайсці абрыў і аднавіць сувязь. Здараліся выпадкі, калі кожны метр абстрэльваўся немцамі. Гэта ўсё роўна, што схадзіць у атаку. Пераўеў дух і зноў шукаць абрыў. Гінулі сувязісты вельмі часта. Іншы раз у адно і тое ж месца ўходзіла 2-3 чалавека. «Рабі, што павінен, і будзе, што будзе». Па гэтаму прынцыпу тады жылі ўсе на фронце. Калі бачыш вакол сябе смерць, перастаеш яе пужацца. Кожны салдат лічыў, што павінен абараняць Радзіму, і яны гэта рабілі.




Аб сабе, аб вайне Фёдар Трафімавіч расказваў неахвотна. Таму вядома аб ім нямногае. А вось пра фарсіраванне рэчкі Проня, што на Слаўгарадчыне, паведаў сынам. Баі ішлі цяжкія. Вельмі многа загінула людзей.

Нямецкія снайперы «палявалі» за сувязістамі. Куля патрапіла ў катушку з кабелем. Рыкашэт, і раненне ў руку навылет. Нават будучы параненым, Фёдар не кінуў катушку і працягнуў паўзці, укрываўшыся ў варонках, пракладваўшы лінію. А кулі працягвалі «свісцець» над галавою. Сувязь была адладжана.

Раненне аказалася цяжкім. А таму, пасля аказання першай дапамогі ў медсанбаце, Курзянкова разам з іншымі параненымі накіравалі ў Маскоўскі эвакуацыйны шпіталь. Лячэнне праходзіла доўга. А потым медыцынская камісія прызнала яго нягодным да ваеннай службы.

Пасля вяртання на Хоцімшчыну, Фёдар хутка знайшоў сваё месца ў мірным жыцці. Уладкаваўся ў пажарную часць. Працаваў добрасумленна.

Потым ажаніўся на прыгажуні Марыі з вёскі Узлогі. Жыў, як гаворыцца, у прымаках. Маладая сям'я вырашыла пабудаваць свой дом у вёсцы Азёраўка. Працаваў у мясцовым калгасе "Запаветы Леніна" у брыгадзе № 4 брыгадзірам.

Калі ж узрост стаў даваць аб сабе ведаць, на сямейным савеце вырашылі пераехаць на пастаяннае месца жыхарства ў Хоцімск. Пабудавалі дом па вуліцы Варашылава. Перад выхадам на заслужаны адпачынак Фёдар Трафімавіч працаваў вартаўніком у калгасе «ІІІ Інтэрнацыянал».

Ф. Т. Курзянкоў быў добрым сем'янінам, з жонкай нарадзілі і вырасцілі чатырох сыноў. Ён пайшоў з жыцця на 73-м гаду, пакінуўшы аб сабе светлую памяць. А дзеці і ўнукі да гэтай пары захоўваюць яго франтавыя і юбілейныя ўзнагароды, баявыя і мірныя граматы.

**Наталля КАЦЯШОВА.**
**Фота з сямейнага альбома**

**Кацяшова, Н. Праца сувязіста на вайне - адказная / Наталля Кацяшова** // Шлях Кастрычніка. — 2025. — 6 жніўня. — С. 5. — фота.

*Курзянкоў Фёдар Трафімавіч, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г.п. Хоцімска.*